# МУЗЕЯЗНАЎСТВА

УДК 069(476):069(051)(47+57)"1931/1940"

*І. Г. Лупашка*

## Пытанні дзейнасці беларускіх музеяў на старонках часопіса «Советский музей» (1931–1940)

*Аналізуюцца публікацыі аб дзейнасці беларускіх музеяў, змешчаныя ў часопісе «Советский музей» у 1930-я гг. Разглядаюцца асаблівасці развіцця музейнай сеткі на тэрыторыі Беларусі, а таксама асобных кірункаў музейнай дзейнасці ў кантэксце сацыякультурных умоў азначанага перыяду. Аўтарам зроблена выснова, што крызісныя з'явы, якія назіраліся ў дзейнасці музеяў, праяўляліся ва ўсіх кірунках музейнай работы.*

Часопіс «Советский музей» пачаў выдавацца ў 1931 г. па рашэнні I Усерасійскага музейнага з'езда (1930, Масква). Згодна з павевамі часу асноўнай мэтай часопіса ставілася асвятленне пытанняў музейнага будаўніцтва ў эпоху дыктатуры пралетарыяту. На той час на старонках выдання абмяркоўваліся такія актуальныя пытанні, як методыка і арганізацыя музейнай справы, дзейнасць айчынных і замежных музеяў, бібліяграфія па музейнай справе, музейная тэхніка і інш. У розныя перыяды выдавалася 4–12 нумароў часопіса за год.

Відавочна, што разглядаемы часопіс з'яўляецца значнай крыніцай па вывучэнні гісторыі і ўсіх кірункаў музейнай дзейнасці ў 1930-я гг. Асобныя даследчыкі звярталіся да гэтай тэмы ў сваіх публікацыях. Напрыклад, Л. Дзёміна разглядае часопіс «Советский музей» як крыніцу па гісторыі музейнага будаўніцтва, Г. Мысліўцава вывучае пытанні экспазіцыйна-выставачнай работы, адлюстраваныя на яго старонках [5; 7]. Да перыядычнага друку як крыніцы па вывучэнні беларускіх музеяў звяртаецца вядомы айчынны навуковец А. Гужалоўскі [4], які разглядае дзяржаўную палітыку і станаўленне сеткі беларускіх музеяў на розных гістарычных этапах.

*Мэта даследавання* – вывучэнне пытанняў дзейнасці беларускіх музеяў, адлюстраваных на старонках часопіса «Советский музей» у дадзены перыяд. Актуальнасць гэтай тэмы абумоўлена абмежаванасцю выкарыстання ў навуковых работах айчынных даследчыкаў перыядычнага друку як крыніцы па вывучэнні дзейнасці беларускіх музейных устаноў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У выніку аналізу ўсіх выпускаў часопіса за разглядаемы перыяд (69 адзінак) можна канстатаваць, што колькасць публікацый, прысвечаных дзейнасці беларускіх музеяў, з'яўляецца невялікай і значна саступае матэрыялам, прысвечаным музеям іншых саюзных рэспублік і аўтаномій. Усяго вылучана тры артыкулы, цалкам прысвечаныя пытанням дзейнасці беларускіх музеяў і некалькі ўпамінанняў у агульнай музейнай хроніцы.

У артыкуле Я. Пружынінай «Музейное строительство Белорусской Социалистической Советской Республики» разглядаюцца агульныя пытанні функцыянавання беларускіх музеяў [8]. Аўтар адзначыла, што неад'емнай часткай культурнай рэвалюцыі БССР з'яўляецца музейнае будаўніцтва, і згодна з патрабаваннем часу падкрэсліла, што «эти успехи – результат неотступного осуществления генеральной линии партии, на страже которой стоит ленинский ЦК ВКП (б) <…> достигнуты в ожесточенной классовой борьбе» [Там жа, с. 50].

Аўтар нівеліруе значную ролю ў развіцці музейнай справы Беларусі прыватных збораў, музеяў царкоўна-археалагічных і створаных пры статыстычных камітэтах: выкарыстоўвае азначэнні «так называемый музей», «уголочки» і інш. Тым не менш узгадваюцца царкоўна-археалагічныя музеі ў Мінску, Віцебску і Магілёве, музеі пры Віцебскай губернскай вучонай архіўнай камісіі і пры Магілёўскім губернскім статыстычным камітэце, а таксама кунсткамера графа Паскевіча ў Гомелі.

Далей разглядаюцца дасягненні ў пабудове музейнай сеткі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Я. Пружыніна прапанавала варыянт класіфікацыі існуючых музеяў: дзяржаўныя; пры ведамствах і ўстановах; мясцовыя. Да дзяржаўных аўтар адносіць музеі, падначаленыя Народнаму камісарыяту асветы: Мінскі сацыяльна-гістарычны музей (з 2009 г. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь) і Віцебскі сацыяльна-гістарычны музей (з 1951 г. Віцебскі абласны краязнаўчы музей).

Што тычыцца ведамасных музеяў, то большасць з іх, на думку Я. Пружынінай, мае «спецыяльны характар» [Там жа, с. 51]. На наш погляд, яны адрозніваюцца прафілізацыяй: Музей рэвалюцыі БССР, Музей паліткатаржан пры доме Камасветы, Цэнтральны дом тэхнікі, музей пры Доме Чырвонай арміі, Музей санітарнай асветы (усе ў Мінску), Ветэрынарны музей (у Віцебску) і інш.

Да мясцовых музеяў аўтар адносіць краязнаўчыя музеі, якіх на момант напісання артыкула (1933) налічвалася 7 і на працягу года планавалася павелічэнне іх колькасці да 15 [Там жа].

Я. Пружынінай таксама зроблена спроба перыядызацыі музейнага будаўніцтва ў БССР (з часоў Кастрычніцкай рэвалюцыі да бягучага пе-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рыяду). Аўтар вылучыла некалькі перыядаў, але, на жаль, не акрэсліла іх храналагічныя рамкі, а толькі дала сутнасныя характарыстыкі.

На думку даследчыцы, першы перыяд адзначаўся тым, што «музеи занимались голым коллекционерством культурнического характера» [8, с. 51]. Другому перыяду характэрна выкарыстанне музея контррэвалюцыйнымі нацдэмамі ў класавых інтарэсах, для падмацавання сваіх «самобытных теорий» [Там жа]. Прыведзены ў артыкуле і адмоўныя прыклады: замест антырэлігійных існавалі аддзелы царкоўныя і сінагог; замест прапаганды ленінскай нацыянальнай палітыкі распаўсюджваліся ідэі шавінізму розных кірункаў. Абвяшчалася, што мінскі і віцебскі музеі з'яўляліся плацдармам нацдэмакратызму і трансліравалі наведвальнікам класава-варожыя думкі і гістарычна памылковыя факты: «даже минский и витебский антирелигиозные отделы не только были хранилищем церковного имущества, но и являлись местом религиозного культа, местом молебнов» [Там жа, с. 52].

Мяркуем, што музейныя супрацоўнікі такім чынам, нават у межах дзейнасці антырэлігійных аддзелаў, імкнуліся захаваць духоўную і матэрыяльную культуру розных рэлігійных плыняў.

На думку Я. Пружынінай, трэці перыяд і круты паварот у музейным будаўніцтве пачаўся тады, «когда рабочий класс под руководством ЦК КП (б) Б нанес нацдемовщине сокрушительный удар» [Там жа]. Было заўважана, як змяняўся кірунак музейнай работы і склад пэўнай часткі музейных работнікаў. Дарэчы, змены, якія адбываліся ў гэты перыяд, адпавядаюць агульным тэндэнцыям дзейнасці савецкіх музеяў, якія станавіліся своеасаблівымі палітыка-асветнымі камбінатамі.

Праведзеныя Усебеларуская нарада музейных работнікаў (люты 1932 г.) і Калегія Народнага камісарыята асветы БССР (красавік 1932 г.) былі значнымі з'явамі, што, па меркаванні Я. Пружынінай, дабратворна ўплывала на ўзровень навукова-даследчай, масава-асветнай работы музеяў і вызначала асноўныя мэты музейнага будаўніцтва. Па выніках гэтых нарад музеі паскоранымі тэмпамі ўключыліся ў справу «развертывания культурной революции, в могучий процесс соцстроительства» [Там жа, с. 53].

Найбольш яскрава павевы новага часу праяўляліся ў рэарганізацыі музейных экспазіцый. Так, Мінскі дзяржаўны сацыяльна-гістарычны музей за кароткі час правёў карэнную рээкспазіцыю ў адпаведнасці з новымі задачамі. Цікавым з фактлагічнага пункту гледжання з'яўляецца апісанне схемы экспазіцыі музея: 1. Першабытнае дакласавае грамадства; 2. Феадалізм; 3. Капіталізм у Беларусі; 4. Перыяд дыктату-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ры пралетарыяту і сацыялістычнага будаўніцтва ў гістарычным разрэзе, пачынаючы з Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г.

Адзначаецца, што экспазіцыя дэманструе агульны гістарычны працэс ва ўмовах пераважна БССР і на беларускім матэрыяле. Гэта стасуецца з сучаснай тэндэнцыяй паказу «лакальнай гісторыі» ў экспазіцыях краязнаўчых музеяў.

У артыкуле Я. Пружынінай даволі падрабязна апісваецца дзейнасць Бабруйскага краязнаўчага музея. Музей меў некалькі аддзелаў, у ліку якіх гісторыя стварэння зямлі, карысныя выкапні, каменныя прылады і іншыя прадметы першабытнага чалавека; аддзел прамысловасці (уключаў тэмы па электраэнергетыцы, тэлеграфе, радыё, маторах унутраннага згарання, аўтамашынах, трактарах, вытворчасці шкла, цэглы, дахоўкі, мыла, воўны, смолакурэння і інш.); лясной гаспадаркі (дэманстравалася фаўна лесу і паляўнічы промысел); антырэлігійны. Адзначаецца, што акрамя пазначаных аддзелаў, у Бабруйскім музеі працавалі выставы, прысвечаныя паходжанню чалавека.

Апісваючы работу музея, аўтар расказвае, што музейныя супрацоўнікі наладзілі сувязі з прадпрыемствамі Бабруйска, якія «снабжают музей соответствующими материалами и экспонатами политехнического характера» [Там жа, с. 54]. Па сутнасці, апісваецца адзін з метадаў актуальнага дакументавання – камплектаванне музейных фондаў, накіраванае на адлюстраванне сучасных працэсаў.

У якасці агульных дасягненняў у сферы музейнага будаўніцтва на тэрыторыі БССР Я. Пружыніна называе стварэнне антырэлігійных аддзелаў і перасоўных выстаў пры большасці дзяржаўных музеяў і актывізацыю масавай палітыка-асветнай работы, якая была накіравана на прыбліжэнне музеяў да вытворчасці, рабочых, калгаснікаў і працоўнага насельніцтва.

У якасці пацвярджэння станоўчай дынамікі масавай палітыка-асветнай работы прыводзяцца статыстычныя даныя дзейнасці Мінскага беларускага дзяржаўнага музея, Гомельскага і Бабруйскага краязнаўчых музеяў. Калі ў звестках Мінскага і Бабруйскага музеяў запоўнены толькі графы «экскурсіі» і «наведвальнікі», то ў Гомельскім музеі рабілася спроба дыферэнцыраваць наведвальнікаў і былі вылучаны наступныя катэгорыі: працоўныя, сяляне, чырвонаармейцы, вучні, служачыя, іншыя.

Згодна з данымі ў артыкуле, у наведванні трох адзначаных музеяў назіралася станоўчая хвалістая дынаміка. Напрыклад, у 1922 г. Мінскі Белдзяржмузей наведалі 5547 чал., а ў 1931 г. – 13 119. Найбольш высокія паказчыкі наведвання музея зафіксаваны ў 1924 г. (16 556 чал.), 1927 г. (15 777), 1929 г. (15 540). Мінімальная колькасць экскурсій была праведзена ў 1922 г. (61), максімальная – у 1929 г. (594). Невялікую колькасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

экскурсій у пачатку 1920-х гг. можна растлумачыць наступным фактам – музейнае экскурсазнаўства ў сучасным яго разуменні было яшчэ ў стадыі свайго заснавання.

Цікавым падаецца і параўнанне колькасці наведванняў у залежнасці ад сацыяльнага складу. Так, Гомельскі музей у 1932 г. наведалі 179 758 чал., з іх: 30 975 вучняў, 23 421 працоўны, 21 542 сяляніна, 7264 служачыя, 6711 чырвонаармейцаў, 2445 іншых. Бабруйскі музей у гэтым жа годзе наведала 22 770 чал., а Мінскі Белдзяржмузей у 1931 г. (за 1932 г. звесткі адсутнічаюць) – 13 119 чал. [Там жа, с. 54–55]. Адзначым, лідарам па колькасці наведвальнікаў сярод трох разглядаемых у артыкуле музеяў быў Гомельскі (цяпер – Гомельскі дварцова-паркавы ансамбль).

Я. Пружыніна звярнула ўвагу на праблемы, што існавалі ў музейнай справе ў разглядаемы перыяд: кадравыя, кіраўніцтва музейнай справай і планавання. Кадравую праблему меркавалася вырашыць за кошт арганізацыі ў 1932 г. аддзялення для падрыхтоўкі музейных супрацоўнікаў пры Магілёўскім палітпрасветтэхнікуме. Пытанні адзінага кіраўніцтва дэлегіравалі Міжведамаснай музейнай камісіі, створанай пастановай Савета Народных Камісараў ад 14 лістапада 1932 г. пры сектары навукі Народнага камісарыята асветы, з прадстаўнікоў Народнага камісарыята асветы, Народнага камісарыята лёгкай прамысловасці, Народнага камісарыята лясной прамысловасці, Народнага камісарыята забеспячэння, упаўнаважанага цяжкай прамысловасці, упаўнаважанага шляхоў зносін, Белкалгасцэнтра і ЦК ЛКСМБ [Там жа, с. 55].

Малаверагодна, што большасць з прадстаўнікоў гэтых ведамстваў мелі прафесійныя музейныя кампетэнцыі, што, несумненна, не магло не адбіцца на пытаннях развіцця музейнай сферы.

Наступны паўнавартасны артыкул аб дзейнасці беларускіх музеяў на старонках часопіса «Советский музей» быў надрукаваны толькі праз 5 гадоў і быў прысвечаны крытыцы сістэмы кіраўніцтва музеямі – «Наркомпрос БССР не руководит музеями» [9]. Згодна з тагачаснымі рэаліямі, ва ўсіх праблемах у музейнай сферы аўтар артыкула І. Раманчук абвінавачвае ворагаў народа, «троцкистско-бухаринских и буржуазно-националистических агентов» [Там жа, с. 27]. Тым не менш кантэнт-аналіз дазволіў вылучыць асобныя факты, якія характарызуюць музейную справу азначанага перыяду.

У артыкуле прыводзяцца статыстычныя даныя наведвання Мінскага сацыяльна-гістарычнага музея (у артыкуле ён называецца Цэнтральным гістарычным музеем Мінска). Згодна з імі назіраецца станоўчая дынаміка, а асноўнай катэгорыяй наведвальнікаў з'яўляюцца навучэнцы (55–60 % ад усёй колькасці наведвальнікаў).

Значная частка артыкула прысвечана пытанням музейнай справы на тэрыторыі Беларусі. Гэтыя пункты разгледзім больш падрабязна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адной з асноўных праблем аўтар называе скарачэнне музейнай сеткі з 15 да 9 адзінак. Ліквідаваны музеі ў Рэчыцы, Оршы, Барысаве, Тураве, Мазыры, Нароўлі.

Далей вылучаюцца праблемы ва ўсіх асноўных кірунках музейнай работы. Адзначаецца, што ў экспазіцыйна-выставачнай дзейнасці існуюць прабелы нават у вялікіх музеях: нягледзячы на тое, што экспазіцыі штогод падвяргаліся частковым змяненням і дапаўненням, «враги народа умышленно срывали правильный экспозиционный показ таких разделов, как "Отмена крепостного права и развитие капитализма в пореформенный период в России и Белоруссии (1861–1900 гг.)", "Великая Октябрьская социалистическая революция и основные этапы социалистического строительства в СССР и его составной части – БССР (1917–1937 гг.)"» [Там жа].

Сярод аб'ектыўных заўваг – недастатковая колькасць экспазіцыйных плошчаў, што прыводзіць да схематычнасці паказу, вялікая колькасць плоскасных экспанатаў і нізкі ўзровень мастацкага афармлення экспазіцый.

Яшчэ адна праблема, якая адлюстроўваецца ў артыкуле, – незадавальняючы стан і недахоп музейных памяшканняў, што ў сваю чаргу вядзе да дрэнных умоў захавання музейных фондаў. І. Раманчук прыводзіць звесткі, што ў чатырох музеях сістэмы Наркамасветы захоўваецца каля 15 000 адзінак мастацкіх твораў, сярод якіх работы Рэпіна, Левітана, Сярова, гравюры XVIII–XIX стст. знакамітых рускіх, англійскіх, французскіх майстроў і інш., аднак яны знаходзяцца ў «сырых, темных подвалах и чердаках и портятся. Никакой научной обработки их <…> не проводят из-за отсутствия помещений, средств и работников» [Там жа]. Такія складаныя ўмовы адзначаюцца ў мінскім, віцебскім, магілёўскім, гомельскім і аршанскім музеях.

Закранаецца таксама пытанне адсутнасці кваліфікаваных кадраў, у чым зноў абвінавачваюцца буржуазна-нацыяналістычныя агенты, якія «сорвали выполнение решения ЦК партии Белоруссии, принятое еще в 1932 г., об организации музейного отделения при Могилевском пединституте. Они сорвали также систему краткосрочных курсовых мероприятий по переподготовке кадров, работающих в музеях» [Там жа, с. 28]. Канстатуецца, што існуючыя кадры музейных навуковых супрацоўнікаў у большасці не маюць спецыяльнай падрыхтоўкі і дастатковага вопыту практычнай работы.

Як адзіную за ўвесь час спробу нармалізаваць сітуацыю аўтар артыкула разглядае правядзенне Наркамасветы Усебеларускай нарады музейных работнікаў БССР, якая адбылася 25–26 лютага 1938 г. На гэтым мерапрыемстве распрацаваны план і тэрміны перабудовы работы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музеяў. У якасці асноўнай задачы пастаўлена перабудова экспазіцый, якую планавалася завяршыць да 20-годдзя заснавання БССР. Асноўнымі кірункамі стварэння новых экспазіцый вызначаны наступныя: «как рабочие и крестьяне Белоруссии благодаря систематической помощи великого русского народа и руководству большевистской партии во главе с Лениным и Сталиным свергли иго помещиков и капиталистов, ликвидировали национально-коллониальный гнёт царизма и русской империалистической буржуазии, разгромили белорусскую националистическую контрреволюцию, отстояли и укрепили диктатуру рабочего класса и превратили советскую Белоруссию в боевой форпост страны социализма на рубеже с капиталистическим миром» [Там жа].

Цікавыя звесткі па гісторыі музейнага будаўніцтва і сістэме аховы гісторыка-культурнай спадчыны на тэрыторыі Беларусі адлюстраваны ў артыкуле «Музеи западных областей Белоруссии» [6]. У ім расказваецца аб пашырэнні музейнай сеткі пасля далучэння Заходняй Беларусі да БССР. Прыводзіцца інфармацыя аб тым, што навуковымі супрацоўнікамі музеяў БССР былі абследаваны такія гарады, як Брэст, Белавеж, Беласток, Баранавічы, Ваўкавыск, Гродна, Нясвіж, Навагрудак, Слонім, Пінск, і выяўлены шэраг помнікаў і музеяў, якія ўзяты на ўлік.

Аўтар артыкула Г. Дзяжко слушна сцвярджае, што Брэсцкая вобласць багатая на гістарычныя помнікі, і адзначае неабходнасць стварэння ў Брэсце гісторыка-рэвалюцыйнага музея. Высокі патэнцыял для арганізацыі аналагічнага музея быў адзначаны і ў Беластоку. Там жа быў выяўлены музей прыроды, у якім дэманстравалася пераважна флора і фаўна Белавежскай пушчы.

Далей прыводзяцца звесткі пра ваўкавыскага краязнаўцу Георгія Пеха, які сабраў значную калекцыю археалогіі, дакументаў XVI–XVII стст., грашовых асігнацый і інш. і, як адзначаецца ў артыкуле, гатовы перадаць яе дзяржаве для стварэння музея. Згодна з сучаснымі данымі, краязнаўчы музей, у аснову якога была пакладзена калекцыя Г. Пеха, працаваў на грамадскіх пачатках з 1935 г. З уваходжаннем Заходняй Беларусі ў склад БССР ён быў нацыяналізаваны і зноў адчынены ў 1940 г. [2].

Апісанне літаратурнага музея Адама Міцкевіча ў Навагрудку змяшчае інфармацыю аб дакладнай колькасці экспанатаў, якія знаходзіліся ў музеі (832 адзінкі), і аб тым, што музей з'яўляецца мемарыяльным, паколькі «помещается в домике, в котором поэт проживал во время детства» [6, с. 44]. Узгадваецца, што музей быў заснаваны Міцкевічаўскім камітэтам, а пасля далучэння перададзены аддзелу народнай адукацыі. Адам Міцкевіч названы польскім паэтам. Аўтар артыкула адзначыў, што «совсем не показаны произведения поэта на русском, еврейском язы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ках» [Там жа]. Складана сказаць, што маецца на ўвазе, улічваючы, што А. Міцкевіч не пісаў на гэтых мовах. Магчыма, гаворка ідзе пра пераклады яго твораў.

Станоўча характарызуецца ў артыкуле Гродзенскі музей, які размешчаны ў даўнім замку і мае 10 добрых і вялікіх залаў. Падкрэсліваецца значная навуковая і музейная каштоўнасць прадметаў, якія захоўваюцца ў музеі: матэрыялы, якія трапілі ў фонды ў выніку археалагічных раскопак польскіх археолагаў Ю. Ядкоўскага і З. Дурчэўскага, а таксама чарцяжы і фотаздымкі раскопак.

Што тычыцца мерапрыемстваў у галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны, то з артыкула вынікае, што Саўнаркам БССР забараніў вываз з тэрыторыі Заходняй Беларусі мастацкіх і архіўных каштоўнасцей без дазволу СНК, а таксама даручыў стварыць абласныя камісіі па вывучэнні, уліку і ахове помнікаў і з гэтай мэтай у 1940 г. арганізаваць экспедыцыю.

Планам на 1940 г. была прадугледжана арганізацыя наступных музеяў: абласных гісторыка-рэвалюцыйных у Брэсце, Пінску і Беластоку; абласнога антырэлігійнага ў Вілейцы; раённых краязнаўчых у Ваўкавыску, Слоніме і Міры; літаратурнага ў Навагрудку; музеяў выяўленчых мастацтваў у Баранавічах, Нясвіжы і Белавежы; гістарычнага ў Гродне [Там жа, с. 45].

Акрамя прааналізаваных артыкулаў, асобныя звесткі аб Беларусі можна знайсці ў раздзеле часопіса «Хроніка». Напрыклад, у № 11 за 1939 г. згадваецца аб рабоце ў Віцебскай вобласці навуковай экспедыцыі па ўліку рэвалюцыйных і гістарычных помнікаў; у № 3 за 1940 г. – аб адкрыцці новай экспазіцыі ў Гомельскім антырэлігійным музеі і падрыхтоўцы дзвюх фотавыстаў «для уголков безбожников на предприятиях и учреждениях» [10; 11]. Астатнія ўпамінанні прысвечаны адлюстраванню музейнымі сродкамі ўз’яднання Заходняй і Усходняй Беларусі, прычым не толькі ў музеях Беларусі. Такія выставы былі створаны ў Дзяржаўным этнаграфічным музеі, Гістарычным музеі і Дзяржаўнай публічнай бібліятэцы імя Салтыкова-Шчадрына, бібліятэцы Акадэміі навук УССР і інш. [3].

У гэтых матэрыялах даюцца таксама пэўныя рэкамендацыі аб арганізацыі экспазіцыйна-выставачнай дзейнасці. Хаця думка навуковага супрацоўніка Інстытута музейна-краязнаўчай работы А. Бярэзіна аб тым, што музеі павінны дэманстраваць не толькі гістарычныя, але і сучасныя з’явы рэчаіснасці, з’яўляецца слушнай, вельмі неадназначнымі падаюцца парады абавязкова выкарыстоўваць у экспазіцыі тэксты дакладаў, прамоў членаў урада, лічбавыя даныя і інш. [1, с. 15]. З гісторыі музейнай справы вядома, што ў выніку гэта прывяло да аднатыпнасці і шаблоннасці экспазіцый, а таксама да перавагі ў іх навукова-дапамож-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных матэрыялаў за кошт арыгінальных музейных прадметаў. У якасці аднаго з прыкладаў рэалізацыі такой канцэпцыі на практыцы прывядзём апісанне экспазіцыйнага комплексу выставы «Народы Западной Украины и Западной Белоруссии», якая дзейнічала ў Дзяржаўным этнаграфічным музеі: «На фоне украинских ковров и белорусских художественных изделий установлен бюст товарища Сталина и текст 123 статьи Сталинской Конституции…» [3].

На падставе аналізу публікацый аб дзейнасці беларускіх музеяў на старонках часопіса «Советский музей» у 1930-я гг. зробім высновы, што ў гэты перыяд у музейнай справе назіраюцца крызісныя з'явы, абумоўленыя складанымі сацыяльна-культурнымі ўмовамі. Яны праяўляюцца ў залішняй палітызаванасці музейнай дзейнасці, што негатыўна паўплывала на ўсе кірункі музейнай работы.

*1. Березин, А.* Показ событий 1939 г. в музейной экспозиции / А. Березин // Сов. музей. – 1940. – № 2. – С. 13–16.

*2.* Волковысский военно-исторический музей им. П. И. Багратиона [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://museum-bagration.by/. – Дата доступа: 25.05.2021.

*3.* Выставки «Народы Западной Украины и Западной Белоруссии» // Сов. музей. – 1939. – № 10. – С. 49.

*4. Гужалоўскі, А. А.* Нараджэнне беларускага музея / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : НАРБ, 2001. – 106 с.

*5. Демина, Л. И.* Журнал «Советский музей» как источник по истории музейного строительства / Л. И. Демина // Музееведение. Из истории охраны и использования культурного наследия в РСФСР : сб. ст. / Науч.-исслед. ин-т культуры. – М., 1987. – С. 174–191.

*6. Дзежко, Г.* Музеи западных областей Белоруссии / Г. Дзежко // Сов. музей. – 1940. – № 1. – С. 44–45.

*7. Мысливцева, Г. Ю.* Вопросы экспозиционно-выставочной работы на страницах журнала «Советский музей» (1931–1940) / Г. Ю. Мысливцева // Территория мечты : сб. тр. Г. Ю. Мысливцевой. – Омск, 2014. – С. 279–286.

*8. Пружинина, Я.* Музейное строительство Белорусской Социалистической Советской Республики / Я. Пружинина // Сов. музей. – 1933. – № 2. – С. 50–55.

*9. Романчук, И.* Наркомпрос БССР не руководит музеями / И. Романчук // Сов. музей. – 1938. – № 8. – С. 27–28.

*10.* Хроника // Сов. музей. – 1940. – № 3. – С. 48.

*11.* XXII годовщина октября в музеях // Сов. музей. – 1939. – № 11. – С. 46–49.

*I. Lupashka*

**Issues of activity of Belarusian museums on the pages of the magazine "Soviet Museum" (1931–1940)**

*The publications about the activities of Belarusian museums, published in the magazine "Soviet Museum" in the 1930s, are analyzed. The developmental peculiarities of the museum network on the territory of Belarus, as well as certain areas of museum activity in the context of socio-cultural conditions of the specified period are considered. The author concludes that the crisis phenomena observed in the activities of museums were manifested in all areas of museum work.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 21.06.2021.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ